BELARUS Live
NEWSLETTER
05-06-2008 – 12-06-2008

## Парлямэнт разгледзіць закон аб СМІ

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзяць закон аб сродках масавай інфармацыі. Дакумэнт накіраваны цяпер у юрыдычнае ўпраўленьне парлямэнту.

## “Прага вясны”

У Менску адбылася прэзэнтацыя зборніка нарысаў пра 14 грамадзкіх актывістаў, якія былі засуджаныя ў 2007 годзе па палітычных матывах.

## Замежныя бізнэсоўцы пад арыштам

Летувіскіх бізнэсоўцаў праваахоўныя органы Беларусі арыштоўваюць і трымаюць пад вартай без прад’яўленьня афіцыйных абвінавачаньняў.

## Даражэе мяса й паліва

Закупачныя цэны на ялавічыну выраслі ў сярэднім на 10% – паведамілі “Інтэрфаксу” ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі й харчаваньня. Прыкладна на столькі ж – каля 10% – падаражэе неўзабаве й паліва.

## На вайсковыя зборы - руш!

Грамадзкія актывісты Павал Наздра й Мікалай Жукоўскі атрымалі павесткі ў Мазырскі ваенкамат.

## Думаеш інакш? Ня будзеш мець чырвонага дыплёму!

Актывіста “Маладога Фронту” і «Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі» Зьмітра Сакалова, лепшага выпускніка Полацкага ліцэю, пазбавілі чырвонага дыплёму з-за палітычных перакананьняў.

Падзея, якая адбылася 5 чэрвеня ў Жэнэве, стала, можа быць, малазаўважнай, але вельмі істотнай. Урад Беларусі пазьбегнуў чаргова жорсткага пакараньня ў ходзе разгляду беларускага пытаньня на паседжаньні Камітэту па нормах і стандартах Міжнароднай арганізацыі працы (МАП). Адхіленьне кіраўніка прапрэзыдэнцкай Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі Л. Козіка ад удзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньні паседжаньня камітэту выключыла магчымасьць арганізацыі якіх-колечы правакацыяў з боку ФПБ, як гэта ўжо стала нормай і як гэта адбывалася роўна год таму ў Жэнэве. Тады, як вядома, каманда Л. Козіка занялася фальсыфікацыяй подпісаў расейскіх і ўкраінскіх прафсаюзаў, вынікам чаго стаў нечуваны скандал, якога сьцены МАП яшчэ ня ведалі. Заканамерным вынікам гэтай правакацыі зьявілася чарговае ўключэньне Беларусі ў спэцпараграф і адкліканьне гандлёвых прэфэрэнцыяў Эўрапейскага Зьвязу.

Скандальнасьць ФПБ у бягучым годзе на сэсіі забясьпечыла нечуванае для любой іншай краіны ў сьвеце ўключэньне ў афіцыйную дэлегацыю Беларусі адразу трох (!) чальцоў сям’і Козікаў – Леаніда, Андрэя і Натальлі. Шансаў патрапіць у афіцыйную дэлегацыю краіны ў прадстаўніка незалежных прафсаюзаў Беларускай канфэдэрацыі дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) не было. Таму кіраўнік БКДП Аляксандар Ярашук быў вымушаны прыехаць на сэсію МАП у складзе дэлегацыі Міжнароднай канфэдэрацыі прафсаюзаў (МКП), чальцом якой зьяўляецца БКДП.

На канфэрэнцыі ў Жэнэве беларускім уладам быў дадзены шанец. Яны павінны падрыхтаваць справаздачу пра выкананьне рэкамэндацыяў Міжнароднай арганізацыі працы да лістапада бягучага году.

Другой важнай падзеяй для беларусаў сталі вынікі нарады ў Аляксандра Лукашэнкі. 5 чэрвеня было прынятае канчатковае рашэньне пра пераход да 11-гадовага школьнага навучаньня. Кіраўнік дзяржавы падкрэсьліў, што пытаньне наконт сыстэмы агульнай сярэдняй адукацыі трэба вырашыць раз і назаўжды.

«Дэкрэт закліканы вырашыць шэраг першачарговых задачаў, якія стаяць перад школай. Захаваць усё найлепшае, што было зроблена за апошнія гады, і ў той жа час пазбавіцца ад непатрэбных наслаеньняў, якія толькі ўскладняюць працэс атрыманьня ведаў і не ўплываюць на якасьць адукацыі», – распарадзіўся Аляксандар Лукашэнка. Дадзены дакумэнт прадугледжвае атрыманьне скончанай агульнай сярэдняй адукацыі ў школе за 11 гадоў. Усе навучальныя ўстановы сярэдняй адукацыі, уключаючы гімназіі і ліцэі, будуць працаваць у рэжыме пяцідзённага навучальнага тыдня. Шосты дзень будзе прысьвечаны фізкультуры і спорту, а таксама факультатыўным заняткам. Агульная працягласьць навучальнага году павялічыцца на адзін тыдзень – да першага чэрвеня.



З навучальнага пляну 11-гадовай школы выключаны прадметы «Айчынная і сусьветная мастацкая культура», «Асновы бясьпекі жыцьцядзейнасьці». У школах Беларусі больш ня будуць вывучаць гісторыю сваёй краіны як асобны прадмет. Курсы «Сусьветная гісторыя» і «Гісторыя Беларусі» будуць аб’яднаныя ў курс «Гісторыя». Прадметы «Музыка», «Выяўленчае мастацтва» будуць выкладацца толькі ў пачатковай школе, а прадмет «Працоўнае навучаньне» сумешчаны з рысаваньнем.

Контррэформа вызваліць, паводле падлікаў Беларускага прафсаюзу работнікаў адукацыі і навукі, 23–30 тысяч настаўніцкіх ставак. А на рынку і так лішак пэдагогаў, у асаблівасьці зь сярэдняй спэцыяльнай адукацыяй… Пагроза звальненьня разам зь неабходнасьцю ўсё лета ў аўральным рэжыме рыхтавацца да працы паводле новых навучальных праграмаў зробіць школьных настаўнікаў куды больш згаворлівымі – а менавіта зь іх складаюцца ўчастковыя выбарчыя камісіі. 28 верасьня на парлямэнцкіх выбарах галасы будуць падлічваць запужаныя і дэмаралізаваныя людзі.

Акрамя таго, гэта дазволіць, як мяркуюць ідэалягічныя капітаны, выключыць у далейшым такія выпадкі, як зь Іванам Шылам у салігорскай сярэдняй школе № 4, калі настаўнікі не пагадзіліся з выключэньнем «маладафронтаўца» са школы і ў ход давялося пусьціць камісію па справах непаўнагадовых пры мясцовай адміністрацыі, а таксама дэсант з чыноўнікаў адукацыі Менскай вобласьці. І ўсё роўна дырэктарка школы Вольга Сянькова звольнілася з-за гэтага рашэньня.

Існуе верагоднасьць, што скасаваньне льготаў у большасьці грамадзянаў краіны, паддобрываньне ўладаў да расейскага і іншага буйнога капіталу, рашэньне пра пабудову АЭС, контррэформа сярэдняй школы нават без бачнасьці абмеркаваньня перагрэюць грамадзкія чаканьні і падарвуць лаяльнасьць. Як вынік, асяродкі канфліктаў пачнуць імкліва распаўсюджвацца.

АФІЦЫЙНА

## Парлямэнт разгледзіць закон аб СМІ

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзяць закон аб сродках масавай інфармацыі. Дакумэнт накіраваны цяпер у юрыдычнае ўпраўленьне парлямэнту.**

На дадзены момант у Беларусі дзейнічае закон аб друку з 1995 году. Журналісты крытыкуюць урад за тое, што праца над новым законам вядзецца ў закрытым рэжыме. Беларускай асацыяцыі журналістаў удалося неафіцыйна азнаёміцца са зьместам дакумэнту. Аказалася, што новыя правілы пашыраюць кантроль дзяржавы над СМІ, перш за ўсё над інтэрнэтам.

Віцэ-міністар інфармацыі Лілія Ананіч мяркуе, што неабходная рэгістрацыя інтэрнэт-выданьняў, каб прадухіліць дэзінфармацыю з боку замежных парталаў. Ананіч прывяла прыклад Кітаю, які заблякаваў доступ да замежных інтэрнэт-сайтаў. Нейкі час таму праект беларускага закону аб СМІ крытыкавалі таксама экспэрты АБСЭ. На іхнюю думку, закон пазбавіць грамадзян доступу да аб'ектыўнай інфармацыі.

КУЛЬТУРА

## “Прага вясны”

**У Менску адбылася прэзэнтацыя зборніка нарысаў пра 14 грамадзкіх актывістаў, якія былі засуджаныя ў 2007 годзе па палітычных матывах.**

Героі кнігі – Канстанцін Лукашоў, Зьміцер Хведарук, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан, Аляксей Янушэўскі, Наста Палажанка, Валер Шчукін, Андрэй Клімаў, Наста Азарка, Іван Шыла, Яраслаў Грышчэня, Зьміцер Дашкевіч, Натальля Ільініч і Артур Фінькевіч – атрымалі крымінальныя прысуды ў 2007 годзе.

Віцэ-прэзыдэнт Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі выказаў падзяку ўсім журналістам, якія адгукнуліся на просьбу напісаць нарысы пра асуджаных актывістаў.

«Я лічу сябе бацькам ідэі стварэньня гэтай кнігі, – сказаў Алесь Бяляцкі. – Але маёй была толькі ідэя. Дзякуй тым людзям, якія ідэю падхапілі і ажыцьцявілі».

Паводле Алеся Бяляцкага, на наступны год мае выйсьці працяг «Прагі вясны».

Мэта выданьня – ня толькі пералічыць выпадкі парушэньня правоў чалавека, але і паглядзець на герояў не ў інфармацыйным, а ў чалавечым пляне.

ГРАМАДЗТВА

## Замежныя бізнэсоўцы пад арыштам

**Летувіскіх бізнэсоўцаў праваахоўныя органы Беларусі арыштоўваюць і трымаюць пад вартай без прад'яўленьня афіцыйных абвінавачаньняў.**

“Затрыманьне летувіскага бізнэсоўца Альвідаса Яблонскіса й утрыманьне яго ў сьледчым ізалятары – гэта сур'ёзны сыгнал для бізнэсоўцаў, якія плянуюць свой бізнэс у Беларусі”, – сьцьвярджае старшыня Сойму Летувы Чэслявас Юршэнас, які сустрэўся з амбасадарам Беларусі Ўладзімерам Дражыным.

Альвідас Яблонскіс утрымліваецца праваахоўнымі структурамі Менску зь 15-га студзеня. Між тым 10-га чэрвеня стала вядома пра затрыманьне ў беларускай сталіцы прадпрымальніка зь Вільні Гінтаса Зінгіса. Спадар Зінгіс займаўся дрэваапрацоўкай у Менску. Яго абвінавачваюць у дачы хабару. Аднак, як запэўнівае жонка прадпрымальніка Элона, прайшоў тыдзень, але афіцыйных абвінавачаньняў яшчэ няма.

На дадзены момант, паводле надуманых абвінавачаньняў, у Беларусі пад вартай знаходзяцца 38 летувіскіх бізнэсоўцаў, пра што піша найбуйнейшая штодзёнка “Лietuvos Rytas” “Лiэтувос Рытас”.

ЭКАНОМІКА

## Даражэе мяса й паліва

**Закупачныя цэны на ялавічыну выраслі ў сярэднім на 10% – паведамілі “Інтэрфаксу” ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі й харчаваньня.**
**Прыкладна на столькі ж – каля 10% – падаражэе неўзабаве й паліва.**

“Белнафтахім” прапануе павысіць кошт бэнзыну на ўнутраным рынку на 5% і дызпаліва – на 15%. Рашэньне будзе прынятае, хутчэй за ўсё, яшчэ на гэтым тыдні – заявіў намесьнік міністра эканомікі Ўладзімер Адашкевіч.

АПАЗЫЦЫЯ

## На вайсковыя зборы - руш!

**Грамадзкія актывісты Павал Наздра й Мікалай Жукоўскі атрымалі павесткі ў Мазырскі ваенкамат.**

Наздра павінен зьявіцца на 17-дзённыя вайсковыя зборы. Павестка была для яго нечаканасьцю. Сам актывіст зьвязвае гэта з тым, што праз два тыдні пачынаецца кампанія па зборы подпісаў для ўдзелу ў акружных выбарчых камісіях. Павал Наздра плянаваў быць чальцом камісіі. Мікалай Жукоўскі адзначыў, што ён здае сэсію ў ВНУ, таму сумняецца ў правамернасьці прызыву на вайсковыя зборы.

6 чэрвеня быў прымусова дастаўлены ў ваенкамат іншы актывіст апазыцыі – Франак Вячорка.

ПАЛІТЫКА

## Думаеш інакш? Ня будзеш мець чырвонага дыплёму!

**Актывіста “Маладога Фронту” і «Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі» Зьмітра Сакалова, лепшага выпускніка Полацкага ліцэю, пазбавілі чырвонага дыплёму з-за палітычных перакананьняў.**

Пасьля суду за акцыю з расьцяжкай «Свабоду палітвязьням!» на галоўнай плошчы гораду супрацоўнікі КДБ наведалі Полацкі ліцэй.

«Прадстаўнікі КДБ размаўлялі пра мяне з намесьніцай дырэктара па выхаваўчай працы Сьвятланай Аляксандраўнай Бараноўскай. Яны хацелі атрымаць агульную характарыстыку, цікавіліся маімі паводзінамі, пасьпяховасьцю ў вучобе, палітычнымі перакананьнямі, пасьля чаго намесьніцу дырэктара папракалі ў тым, што яна няправільна выхоўвае моладзь», – кажа Зьміцер.

Зьміцер Сакалоў зьяўляецца лепшым у групе па вучобе, і да візыту прадстаўнікоў КДБ ён быў адзіным прэтэндэнтам на чырвоны дыплём. Аднак пасьля пэдагагічны калектыў вырашыў не ісьці на канфлікт з КДБ і пазбавіў выпускніка чырвонага дыплёму.

Belarus live
European Radio for Belarus
polishaid
Polonia
POLSKIE RADIO

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.